# Паліталогія

*С.І. СІМАНОЎСКІ*

## МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПАРАЎНАЛЬНАГА АНАЛІЗУ Ў ПАЛІТЫЧНАЙ НАВУЦЫ

Рассматривается метод сравнительного анализа в политической науке как основа ее специфической отрасли - сравнительной политологии; делается вывод о том, что сравнительные политические исследования выявили ряд методологических проблем, споры по которым продолжаются и сегодня. Они выражаются в противоречиях, существующих между качественными и количественными сравнительными исследованиями.

The article gives a critical review of the method of comparative analysis in the political science as a basis of its specific branch - comparative politics. The author makes the conclusion that the comparative political research has revealed a number of methodological problems, which are still the subject of discussions nowadays. Their major point lies in contradictions between qualitative and quantitative methods of comparative research.

У пачатку XXI ст. свет заняты пошукам новых мадэляў грамадзянскага ўпарадкавання, альтэрнатыўных шляхоў, якія вядуць да эканамічнага росту, розных стратэгій дзеля пераходу да дэмакратыі, эфектыўных форм кіравання і выкарыстоўвання ўрадамі сваіх паўнамоцтваў.

Рэспубліка Беларусь таксама знаходзіцца на этапе карэнных трансфармацый ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. У гэтых умовах узрастае патрэба ў навуковых даследаваннях, якія растлумачваюць тэарэтычныя і практычныя аспекты функцыяніравання дэмакратычнай палітычнай сістэмы.

Параўнальны аналіз - гэта моцны і універсальны інструмент, які пашырае магчымасці разумения і апісання палітычных працэсаў і змяненняў у любой краіне адпаведна існуючай рэальнасці, канцэпцыям і мэтам канкрэтнай палітычнай сістэмы. Ён таксама стымулюе стварэнне агульных тэорый палітычных сістэм і ўзаемаадносін паміж імі, што дазваляе правяраць любыя палітычныя тэорыі, супастаўляючы іх з вопытам функцыяніравання дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў розных краін. Трэба адзначыць, што параўнальны аналіз як метад у даследаванні палітычных праблем і працэсаў у цяперашні час айчыннымі паліталагамі выкарыстоўваецца вельмі рэдка. Прычын таму шмат. Некаторыя лічаць, што метады, якія шырока выкарыстоўваюцца заходнімі вучонымі-паліталагамі, немагчыма ў чыстым выглядзе перанесці ў палітычную навуку той ці іншай краіны. З такім сцвярджэннем можна пагадзіцца толькі часткова. Сёння заходняя паліталогія ўключае ў сябе шмат розных методык (з сацыялогіі, эканомікі, гісторыі і іншых навук) і мае унікальныя, спецыфічныя рысы, якія цяжка ўспрымаюцца ў другой дзяржаве са сваімі нацыянальнымі традыцыямі, як, напрыклад, у Рэспубліцы Беларусь. Складанасць параўнання і робіць важнымі намаганні ў гэтай сферы, таму што правядзенне параўнання палітыкі, палітычных сістэм розных дзяржаў дае магчымасць вывучыць і выкарыстаць іх вопыт. Менавіта таму і неабходна шырока ўжываць метад параўнальнага аналізу ў палітыцы, аднак пры гэтым узнікае патрэбнасць у больш грунтоўнай яго тэарэтыка-метадалагічнай распрацаванасці ў адпаведнасці з канкрэтнымі ўмовамі пэўнай краіны. Адзначаючы гэту праблему, расійскі вучоны Н.І. Бачкар падкрэс-

ліў, што "...метадалогіі паліталогіі ўдзяляецца недастаткова ўвагі ў нашай літаратуры. У шэрагу вучэбных дапаможнікаў ёй адводзіцца вельмі сціплае месца. Даецца пералік, набор выкарыстоўваемых метадаў, а не цэласнае сістэмнае разумение метадалогіі"[1]. (Тут і далей - пераклад аўтара.)

Між тым метад параўнальнага аналізу дапамагае тлумачыць і больш аб'ектыўна вывучаць палітычныя працэсы. Яго навуковае даследаванне будзе садзейнічаць выкарыстоўванню станоўчага вопыту розных краін свету па будаванню дэмакратычнай прававой дзяржавы ў Беларусі.

Метад параўнальнага аналізу мае даўнія вытокі і з'яўляецца такім жа старажытным, як і вывучэнне палітыкі. Яго актыўна ўжываў грэчаскі філосаф Арыстоцель, які даследаваў палітычнае ўладкаванне 158 вядомых яму дзяржаў-полісаў. Пры параўнанні розных форм дзяржавы ён выкарыстаў дыхатомную метадалогію падзялення на роды і віды і заклаў асновы марфалагічнага віду параўнання. Некаторыя элементы параўнальнага аналізу можна знайсці ў Палібія, Цыцэрона і інш. Значны ўклад у развіццё гэтага метаду ў розны час унеслі таксама Ф. Аквінскі, Н. Макіявелі, Ш.Л. Мантэск'е, А. Таквіль, Дж. Міль, М. Вэбэр і др. Усе гэтыя метадалагічныя традыцыі па-рознаму ўзнаўляюцца ў сучасных параўнальных даследаваннях, пры гэтым падвяргаюцца натуральнай мадыфікацыі і развіццю. У наш час гэты метад дазваляе перайсці ад апісальнай функцыі (што? дзе? калі?) да тлумачэння і выяўлення каузальных сувязей (як? навошта? чаму?).

Параўнанне ўласнага вопыту з вопытам іншых нацый значна паглыбляе перспектыву ўдасканальвання і развіцця палітычнай сістэмы сваёй краіны, дае магчымасці бачыць больш шырокі дыяпазон палітычных альтэрнатыў і шляхоў развіцця, раскрывае годнасць і недахопы ў асабістым палітычным жыцці, значна пашырае разумение магчымасцей палітыкі.

Логіка і прынцыпы параўнальных метадаў, якія выкарыстоўваюцца паліталагамі, падобны на тыя, што ўжываюцца ў дакладных навуках. І хоць палітолаг (як, напрыклад, матэматык) не можа зрабіць дакладны стопрацэнтны прагноз, тым не менш, ён можа дастаткова аб'ектыўна аналізаваць розныя палітычныя з'явы (прычыны, ход, вынікі), якія мелі месца ў мінулым і якія адбываюцца ў наш час, а таксама рабіць прагнозы на будучае.

Многія заснавальнікі сучаснай палітычнай навукі другой паловы XIX ст. рабілі стаўку на параўнальны аналіз. Гісторыя паказала, што яны не памыліліся. Сучасная параўнальная паліталогія з'яўляецца адной з самых развітых навуковых дысцыплін на Захадзе, мае моцны метадалагічны і метадычны інструментарый і багатую тэарэтычную выснову. Як кожны жывы арганізм, яна развіваецца, праходзячы праз кропкі крызісу і пад'ёму. Параўнальная паліталогія вывучае палітычную рэальнасць, імкнецца аб'яднаць эмпірычны і тэарэтычны ўзроўні аналізу і сфармуляваць агульназначымыя разважанні аб узаемасувязях усяго палітычнага міру.

Метадалогія параўнальнага аналізу з'яўляецца адным з галоўных накірункаў у сучаснай палітычнай навуцы. Аднак у айчыннай палітычнай літаратуры, як было адзначана раней, не распрацаваны яшчэ такія важныя катэгорыі, як метад параўнальнага аналізу, кроснацыянальнае параўнанне і інш. У той жа час у заходняй паліталогіі сфера параўнальнай паліталогіі мае багатыя тэарэтычныя І эмпірычныя напрацоўкі.

Такія вучоныя-кампаратывісты, як Р. Макрыдыс, Б. Браун, Г. Алманд, Г. Пау-эл, Т. Маккі, Д. Марш і іншыя, пры даследаванні палітычных працэсаў, сістэм, рэжымаў шырока прымяняюць гэты параўнальны метад для таго, каб знайсці аптымальны тып палітычнай сістэмы ў сваёй краіне[2]. Другія тэарэтыкі параўноўваюць канстытуцыйныя рэжымы з тыраніяй, двухпартыйныя і шматпартыйныя дэмакратычныя сістэмы - з аднапартыйнымі, стабільныя ўрады - з няўстойлівымі.

Тэарэтычныя даследаванні метаду параўнальнага аналізу ў палітычнай на-вуцы можна знайсці ў працах амерыканскіх даследчыкаў Р.Х. Чылкота, Дж.Б. Мангейма, Р.К. Рыча і інш.[3] У апошні час праблемамі аналізу па-раўнальнай палітыкі сталі займацца і расійскія вучоныя Г.В. Голасаў, М.В. Ільін, Л.В. Смаргуноў[4].

Метад параўнання можна вызначыць як агульную ўстаноўку пазнання: пры параўнанні фактаў, элементаў, з'яў вучоны-кампаратывіст выяўляе агульнае ці рознае паміж працэсамі. Можна сказаць, што параўнанне як метад пазнання прадстаўляе сабой спосаб выяўлення агульнага і асабістага ў феноменах, прызначаных для вывучэння.

Сутнасць "праблемы параўнальнасці" заключаецца ў тым, што пры даследаванні некалькіх аб'ектаў заўсёды ўзнікае пытанне магчымасці іх параўнання. Э. Макінтайр, напрыклад, дае адмоўны адказ на яго, лічачы, што кожнае грамадства з'яўляецца унікальным і прадстаўляе сабой непаўторны ансамбль культурных установак, палітычных практык, інстытутаў. Таму любая спроба вызначыць у іх супаставімыя элементы прывядзе да спрашчэння рэальнасці і значна збядніць кроснацыянальнае параўнанне[5]. Калі ўсё ж паспрабаваць выявіць агульныя элементы, дык і тады не будзе гарантыі, што ў розных грамадствах існуюць аднолькавыя каузальныя сувязі, паколькі падобныя вынікі могуць быць выкліканы рознымі прычынамі.

Вучоныя-кампаратывісты (Дж. Міль, Р. Макрыдыс і інш.) лічаць, што кроснацыянальнае параўнанне магчыма ў тым выпадку, калі супастаўляюцца краіны, якія падобны па большасці параметраў (эканамічных, палітычных, гістарычных, культурных і г. д.), ці, наадварот, - процілеглыя. Пры гэтым параўноўваюцца цэлыя дзяржавы, іх асобныя часткі, рэгіёны. Даследчык-кампаратывіст, на іх думку, можа павялічваць ступень параўнальнасці за кошт пошуку аднародных структурных кантэкстаў вывучаемай залежнасці, а не параўнання яе зместу[6].

Р. Макрыдыс лічыць, што параўнанне павінна ўключаць у сябе пэўнае абстрагаванне, таму што канкрэтныя сітуацыі і працэсы немагчыма параўноўваць у поўнай меры. На яго думку, параўнанне - гэта выяўленне канкрэтных тыпаў і канцэптаў, але пры гэтым непазбежна скажэнне унікальных, своеасаблівых рыс.

Значны ўклад у вырашэнне "праблемы параўнальнасці" ўнеслі вядомыя вучоныя-метадолагі А. Пржэворскі і Г. Т'юн[7], якія лічаць, што даследніцкая стра-тэгія кроснацыянальнага параўнання павінна рэалізоўвацца на двух узроўнях: макрасацыяльным (калі параўноўваюцца зменныя, якія характарызуюць гра-мадства ў цэлым) і ўнутрысістэмным (калі кожная са зменных фіксіруе якую-небудзь асабістую характарыстыку грамадства). Мэтай параўнальнага аналізу, на іх думку, з'яўляецца раскрыццё сувязей паміж зменнымі другога ўзроўню.

Не менш важнай у метадзе параўнальнага аналізу з'яўляецца праблема, якую сфармуляваў вядомы вучоны А. Лійпхарт[8], "мала выпадкаў, шмат зменных". Ён лічыць, што ў свеце існуе абмежаваная колькасць краін (выпадкаў), такім чынам, не ўсе магчымыя варыянты палітычных сістэм і іх элементаў даступны для даследчыка-кампаратывіста. Таму перад ім узнікае шэраг складаных пытанняў. З аднаго боку, каб зрабіць даследаванне больш абгрунтаваным, ён павінен прааналізаваць максімальную колькасць агульных выпадкаў, што вядзе да скарачэння колькасці вывучэння зменных. З другога боку, грамадскае жыццё вельмі разнастайнае, таму і колькасць зменных, якія патрэбны для аналізу, таксама будзе імкнуцца да бясконцасці. Пры гэтым узнікае праблема: якія са зменных з'яўляюцца вызначальнымі, а якія неістотнымі, таму што ў канкрэтных нацыянальных кантэкстах яны могуць мець розныя значэнні.

Для вырашэння гэтай праблемы некаторыя вучоныя прапаноўваюць максімальна, па магчымасці, павялічваць лічбу выпадкаў пры свядомым абмежаванні колькасці зменных. Аднак аналіз мноства выпадкаў можа прывесці даследчыка да недастатковага вывучэння ўзаемаўплыву зменных на ўнутрысістэмным узроўні. Каб пазбегнуць гэтай складанасці, некаторыя палітолагі звяртаюцца да параўнанняў "другога парадку", г. зн. параўноўваюць не асобныя зменныя, а цэлыя "іерархіі", ланцугі ўзаемазвязаных зменных. Такія параўнанні "другога па-радку" становяцца магчымымі пры ўмове абмежавання колькасці даследуемых выпадкаў. Парадаксальна, але адзін з эфектыўных спосабаў вырашыць праб-лему "шмат зменных - мала выпадкаў" прадугледжвае свядомае абмежаванне кола вывучаемых краін пры павелічэнні колькасці зменных, неабходных для аналізу.

Важнай праблемай метаду параўнальнага аналізу з'яўляецца інтэрпрэтацыя дадзеных, якія атрыманы вучоным-кампаратывістам, кожны з якіх ацэньвае іх суб'ектыўна. Вырашыць гэту праблему можна шляхам укаранення ў палітала-гічныя даследаванні новай метадалагічнай арыентацыі - навуковага рэалізму.

Трэба адзначыць, што параўнанне не з'яўляецца самамэтай навуковага паліталагічнага даследавання. Яно выступае своеасаблівым падыходам да вывучаемага ім прадмета, які даследуецца разам са шматграннымі нацыяналь-нымі і рэгіянальна-палітычнымі ўмовамі і з магчымымі яго мадыфікацыямі. Такім чынам, галоўнай задачай вучонага-кампаратывіста з'яўляецца не параўнанне канкрэтных форм палітычных феноменаў і іх умоў, а пошук залежнасцей, больш эфектыўных канцэпцый і мадэляў, сістэм палітычнага развіцця той ці іншай краіны. Параўнанне ў гэтым выпадку з'яўляецца не проста метадам, а дас-ледніцкай метадалагічнай стратэгіяй, светапоглядам вучонага, пры гэтым за-кранае прадмет вывучэння, зыходную канцэптуальную структуру, даследніцкія гіпотэзы, інструменты вымярэння і аналізу эмпірычнага матэрыялу, навуковы рэзультат - сінтэзаваныя канцэпцыі, класіфікацыі, мадэлі і тэорыі.

Метад параўнальнага аналізу ў палітычнай навуцы з'яўляецца асновай яе спецыфічнай галіны - параўнальнай паліталогіі, развіццё якой выклікае шэраг метадалагічных праблем паміж якаснымі і колькаснымі параўнальнымі даследаваннямі. Дыскусійнасць параўнальнага метаду выражаецца таксама і ў відах параўнання, якія ў цяперашні час прапаноўвае сучасная палітычная навука.

1 Фундаментальные проблемы политической науки: Круглый стол в МГУ // Вестн. МГУ. Сер. 12. 1996. № 6. С. 21.

2 Гл.: Almond G. A., Powell G. B. Comparative Politics Today. 5, h ed. New York, 1992; Macridis R., Brown B. Comparative Politics. Notes and Readings. Homewood, III: Dorsey Press, 1961; Mackie T., Marsh D. The Comparative Method//Theory and Methods in Political Science / D. Marsh, G. Stoker (eds.). London, 1995.

3 Гл.: Чилкот Р.Х. Теории сравнительной политологии. М., 2001; Мангейм Дж.Б., Рич Р.К. Политология. Методы исследования. М., 1997.

4 Гл.: Голосов Г. В. Сравнительная политология. Новосибирск, 1995; Ильин М. В. Сравни-тельная политология: научная компаративистика в системе научного знания // Полис. 2001. №4; Сморгунов Л. В. Сравнительная политология: Теория и методология измерения демократии. СПб., 1999.

5 Гл.: Macintyre A. Is a Science of Comparative Politics Possible? // Philosophy, Politics, and Society, 4th ser. Oxford, 1972.

6 Гл.: Mill J. How We Compare // Comparative Political Systems. New York, 1991; Macridis R., Brown B. Comparative Politics. Notes and Readings. 7th ed. New York, 1990.

7 Гл.: Przeworski A., Teune H. The Logic of Comparative Social Inquiry. New York, 1970.

8 Гл.: Lijphart A. The Comparable-Cases Strategy in Comparative Research // Comparative Political Studies. Berkeley, 1975. Vol. 8. № 2.

**Паступіў у рэдакцыю 13.01.2003.**

***Сяргей Іванавіч Сіманоўскі*** - кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры паліталогіі.

*Д.Г. АРГУЧИНЦЕВА*

# НАЦИОНАЛИЗМ: ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЙ АСПЕКТ ПРОБЛЕМЫ

Анализируется термин «национализм»; показана вариативность его трактовок; делается вывод о том, что специфика современных проявлений национализма позволяет рассматривать данную идеологию с позиций инструментального подхода в контексте политических технологий.

The article analyses the concept of «nationalism» and gives a variety of interpretations of the term. The specific features of its modern character allow the author to consider this ideology from the point of view of instrumental approach in the context of political technologies.

Становление и развитие белорусского суверенного государства, поиск национально-государственной идентичности обусловлены как внутренними, так и внешними геополитическими причинами. Поэтому обращение к идеям нации-государства и национализма актуализируется.

Идеология национализма и проблемы развития национального самосознания приобрели в последние десятилетия особое значение. Сегодня в мире про-